Мінсувязі прапануе ўсім скарыстацца магчымасцямі партала рэйтынгавай ацэнкі дзяржаўных арганізацый

Па заказе Міністэрства сувязі і інфарматызацыі быў распрацаваны партал рэйтынгавай ацэнкі арганізацый , якія аказваюць паслугі, забяспечваюць жыццядзейнасць насельніцтва, і (або) ажыццяўляюць адміністрацыйныя працэдуры.

Зараз партал рэйтынгавай ацэнкі пастаянна функцыянуе і даступны ў сетцы Інтэрнэт па адрасе качество-услуг.бел , для зручнасці выкарыстання гэтага партала грамадзянамі створана і працуе яго мабільная версія.

На сённяшні дзень на партале зарэгістравана больш за 12 тыс. арганізацый і больш за 17 тыс. карыстальнікаў.

Партал з'яўляецца інструментам, які прадастаўляе грамадзянам магчымасць даць ацэнку, а таксама, пакінуўшы каментар, выказаць сваё меркаванне адносна эфектыўнасці дзейнасці дзяржаўных органаў і арганізацый. Ацэнка адбываецца па 5-бальнай шкале па наступных крытэрах: прастата і зразумеласць працэсу атрымання паслугі; даступнасць інфармацыі аб парадку атрымання паслугі; захаванне ўстаноўленага тэрміну прадастаўлення паслугі; ветлівасць і добразычлівасць супрацоўнікаў. Такі механізм зваротнай сувязі дзяржавы і грамадства ставіць сваёй мэтай павышэнне эфектыўнасці работы з грамадзянамі, якасці забеспячэння жыццядзейнасці насельніцтва і адкрытасці дзяржаўных органаў і арганізацый.

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі прапануе ўсім скарыстацца магчымасцямі партала рэйтынгавай ацэнкі дзяржаўных арганізацый.

Source URL: *https://www.xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/10-06-2020-6442*